**ПРАБЛЕМЫ АДАПТАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ДА ПАТРАБАВАННЯЎ СУЧАСНАСЦІ ДЛЯ МУЗЫЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ ТВОРЧЫХ ВНУ**

(на прыкладзе дысцыпліны сальфеджыо/джазавае сальфсджыо на напрамку «эстрадныя спевы»)

*Дожына Н.І.,*

Адукацыйны працэс напачатку XXI стагоддзя як у Беларусі, так і ў іншых краінах славянскага і еўрапейскага арэалаў накіраваны на вырашэнне пра- блем глабалізацыі і інтэграцыі, павышэння якасці адукацыі вышэйшай школы. Паступовае рэфармаванне адукацыйнай сістэмы згодна патрабаванням Балонскага працэсу прадугледжвае не толькі перагляд сістэмы адукацыі на структурна-ступеневым, тэрмінова-часавымікваліфікацыйнымузроўнях, але і ў дачынснні да перапрацоўкі метадалагічных і навукова-тэхналагічных падыходаў да адукацыі ўвогуле і да кожнай асобнай дысцыпліны ў прыватнасці. Як адна з рэальна магчымых і эфектыўных на сенняшні момант форм пераходу на якасна новы сучасны ўзровень падаецца модульны падыход да сістэмы вышэйшай адукацыі, які паступова набывае ўсе боль- шую распаўсюджанасць у выглядзе вучэбна-метадычных комплексаў но- вага пакалення. Пра яго станоўчую функцыянальную моц ужо існуе шмат меркаванняў, прац і распрацовак [1], у якіх мэтанакіравана выказваецца, што «модульны падыход дапамагае вырашыць праблему якасці вышэйшай адукацыі. Для яго рэалізацыі неабходна ўлічваць не толькі навучанасць, але інавучанне студэнтаў, індывідуальны тэмп, будаваць іх індывідуальны аду- кацыйны маршрут, укараняць метады эфектыўнай дыягностыкі вучэбных дасягненняў і прафесійнага росту» [2, с. 32].

Пераход на сучасныя тэхналогіі навучання, асабліва ў творчых вну, прыцягвае за сабой шэраг праблем, якія натуральна паўстаюць на розных узроўнях і этапах. Першая з іх звязана з перабудовай і адаптацыяй творчых дысцыплін практычнага накіравання (асабліва для музычных спецыяльнас- цей, напрыклад, сальфеджыо), з аднаго боку, да патрабаванняў модульнай тэхналогіі, якая ў большасці арыентавана на лекцыйна-інфармацыйныя дысцыпліны, з другога — да новых палажэнняў адукацыйных стандартаў. Апошнія, дарэчы, у дачыненні да мастацкіх дысцыплін, на жаль, не заўседы адпавядаюць пажаданням выкладчыкаў і студэнтаў, менавіта ў адносінах да тэрміну навучання, колькасці адведзеных на тую ці іншую дысцыпліну гадзін, крытэрыяў ацэнкі якасці і г. д. Разам з тым, змест творчых дысцыплін, якія вызначаны ў тыповых і рабочых вучэбных праграмах павінен натуральна пашырацца ў аб'ёме вывучаемага матэрыялу за кошт увядзення новых тэм, звязаных з рэаліямі сучаснай культуры і мастацтва. Для сальфеджыо, якое ўвесь час будавалася перш за ўсе на традыцыйных формах інтанавання, слыхавога ўспрымання, развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычнай памяці, метрарытмічнага ад- чування і грунтавалася на матэрыяле акадэмічнай старажытнай і класіка- рамантычнай музыкі, на сенняшнім этапе павінна быць распрацавана і дапоўнена тэарэтычным, інструктыўным і мастацкім матэрыялам з сучаснай акадэмічнай і эстрадна-джазавай музыкі. У вялікай ступені гэта датычыцца напрамку «эстрадныя спевы», які на сучасны момант карыста- ецца вельмі шырокай папулярнасцю і вытрымлівае значныя конкурсы пры паступленні ва ўстановы сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

Трэба адзначыць у сувязі з гэтым і яшчэ адну праблему. Яна датычыцца кантынгенту паступаючых на гэтую спецыяльнасць студэптаў. Узро- вень іх музычнай падрыхтоўкі часцей за ўсе не адпавядае патрабаван- ням сучаснасці: вялікі працэнт студэнтаў не мае сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дыплома музычнай школы ці нават увогуле ніякай музычнай падрыхтоўкі. Выкладчыку патрабуецца не толькі навучыць іх на сальфеджыо музычнай граматнасці (элементарная тэорыя музыкі ў вну для гэтай спецыяльнасці не выкладаецца), развіць навыкі асэнсаванага спеву па нотах, слухання і слышання музыкі, але і сумяшчаць акадэмічныя формы работы сальфеджыо з засваеннем ведаў і навыкаў па сучасным і эстрад- на-джазавым сальфеджыо. Паколькі сальфеджыо выкладаецца для эстрадных спевакоў на працягу пяці год навучання ў вну, то на наш погляд, гэта магчыма ажыццявіць наступным чынам: на пcршых курсах закладаецца акадэмічная аснова з прагрэсіруючым увядзеннем элементаў джазавага стылю і поўным пераходам да яго на старэйшых курсах.

Немалаважнай праблемай з'яўляецца і недахоп вучэбнай і метадычнай літаратуры, дрэннае наведваі іне заняткаўу сувязі з гастраліраваннем, свабодным графікам навучання многіх студэнтаў-артыстаў, якія працуюць у прафесійных эстрадных калектывах — Дзяржаўным эстрадна-сімфанічным аркестры Беларусі пад кіраўніцтвам М.Я. Фінберга, ансамблі «Верасы», маладзёжным тэ- атры эстрады, новым праскце «Тры плюс два» і іншых. Нерэгулярнасць навучання дыктуе заканамерную несістэматычнасць засваення ведаў і практычных навыкаў што пэўным чынам адбіваецца на прафессіяналізме выпускнікоў.

Насычанасць універсітэцкай праграмы агульнаадукацыйнымі прадметамі ўплывас натуральным чынам на скарачэнне колькасці гадзін, якія адводзяцца на спецыяльныя дысцыпліны творчага блоку, у тым ліку сальфеджыо, якое для вакалістаў не толькі неабходны інструмент і іх «стратэгічная зброя», але і значны паказнік прафесіяналізму.

На першым этапе паступовага пераходу на блочна-модульную тэхналогію навучання прыкметным новаўвядзеннем для дысцыпліны сальфеджыо стала стварэнне і вылучэнне ў тэматычным плане вучэбнай праграмы [3] новага вучэбнага блока, датычнага сучаснай музыкі — «Стылістычныя асаблівасці музыкі XX стагоддзя». Распрацоўка яго змястоўнай напоўненасці і выкладчыцкай тактыкі па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаўленні да музыкі, якую раней практычна не прыходзілася інтанаваць студэнтам-вакалістам эстраднага профілю, - задача няпростая. Звязана яна таксама і з праблемай заканамернага пераадолення таго інтанацыйна-слыхавога бар'ера, які ўзнікае ў студэнтаў. Аднак яшчэ больш складанай з'яўляецца праблема недастатковасці, і, больш таго, практычнай адсутнасці вучэбных сальфед- жыйных зборнікаў, хрэстаматый па сучаснай музыцы ў Беларусі. Заказ і набыццё расійскіх выданняў на сённяшні дзень у сілу вядомых абставін таксама фактычна немагчыма. Адзін з шляхоў выхаду з гэтай сітуацыі — складанне і ўжыванне хрэстаматыі па сучаснаму і джазаваму сальфеджыо і фонаальбома тэмбравых дыктантаў, распрацоўка і ўкараненне якіх у ву- чэбны працэс ужо пастулова і даволі паспяхова ажыццяўляецца.

Спецыфіка сальфеджыо для напрамку «эстрадны вакал» прадыкта- вала неабходнасць выкарыстання і адмысловай вучэбнай літаратуры, аснову якой павінны складаць адна- і шматгалосныя ўзоры з айчыннага і замежнага эстраднага рэпертуару, класічнага і сучаснага джаза. Забеспячэнне падобнымі вучэбнымі матэрыяламі таксама пакуль заста- ецца праблематычным, хоць некаторыя з выдадзеных яшчэ ў апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя зборы знаходзяць цяпер актыўнае ўжыванне ў вучэбным працэсе [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура


1. Макаров, А. В. Модульное обучение: аналитический обзор//Выш. шк. — 2007.-№3.-С. 66-67
2. Лобанов, А.П. Модульный подход в системе высшего образования: основы структурализации и метапознания/А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. — Минск: РИВШ, 2008.
3. Серебряный, М. Сольфеджио на ритмо-интонационной основе современной эстрадной музыки, — Киев: Музычна Украіна, 1987;
4. Хромушин, О. Джазовое сольфеджио. — Спб.: Северный олень, 1998.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ